Виртуальный вариант аналоговой доски под названием Miro используется как онлайн-платформа для совместной работы участников образовательного процесса. Это бесконечная онлайн-доска для совместного удаленного использования, на которой можно размещать изображения, документы pdf, создавать стикеры, просто писать или рисовать, транслируя результаты в режиме реального времени.

Работать на доске можно с помощью голосовых сообщений или видеочата. Создавая стикеры, участники имеют возможность размещать на них ссылки, ставить лайки и оставлять комментарии. Доску можно использовать в любое удобное время, главное требование — наличие интернет-связи.

Miro хорошо проявила себя в работе над совместными обсуждениями проектов, проведении мозговых штурмов и удобном представлении любых наработок. В Miro комфортно следить за продвижением работы отдельных участников, выделять наиболее значимые моменты, удалять выполненные задачи, визуализировать процессы. Пользоваться виртуальной доской можно бесплатно, пройдя регистрацию на сайте. После создания проекта достаточно поделиться ссылкой с участниками и можно приступать к совместной работе. Для регулярной работы с доской лучше приобрести одну из платных версий программы. Это даст еще больше возможностей использования полезных и удобных инструментов Miro.

Таким образом, обучение в формате онлайн актуально, результативно и востребовано участниками образовательного процесса. Сервисных возможностей для создания и проведения занятий в формате онлайн, организации обучения в любое удобное время, использования разнообразных инструментов облачного пространства немало. Главными требованиями для проведения дистанционных занятий является наличие технического оснащения с возможностью доступа к качественной и высокоскоростной интернет-связи. Данная форма обучения применима для многих категорий обучающихся с разными образовательными запросами — для учащихся I, II и III ступеней общего среднего образования, студентов учреждений профессионально-технического, среднего специального и высшего образования, для повышения профессиональной квалификации и др. Занятия онлайн предоставляют доступ к качественному образованию всем обучающимся, независимо от места их проживания.

**Список литературы**


1. Концепции цифровой трансформации процессов в системе образования Республики Беларусь на 2019–2025 годы // Городской методический портал [Электронный ресурс] / Режим доступа: http://metodist.mgddm.by/. — Дата доступа: 04.04.2022.
2. Машевская, О.В. Цифровая трансформация и сфера образования / О.В.Машевская // Электронная библиотека БГУ: Общественные науки: Народное образование. Педагогика [Электронный ресурс] / Режим доступа: https://elib.bsu.by/handle/123456789/243163 .— Дата доступа: 12.04.2022.
3. Кутовенко, А.А. Облачные и сетевые технологии в учебном процессе / А.А.Кутовенко, В.В. Сидорик; под общ. ред. В. В. Сидорика. [Электронный ресурс]: учеб.-метод. пособие: Минск, БНТУ, 2020 / Режим доступа: https://clck.ru/rcQbR. — Дата доступа: 15.10.2022.


*Дата поступления в редакцию: 17.10.2022*

# ВЫКАРЫСТАННЕ ТАБЛІЦ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў V–VI КЛАСАХ

*Шырынава Людміла Віктараўна*

***Анатацыя.*** *У артыкуле разглядаецца пытанне развіцця вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў V–VI класаў на ўроках беларускай мовы. Сутнасць звароту да яго абумоўлена надзённай адукацыйнай праблемай — няўменнем сучасных падлеткаў практычна і свядома працаваць з разнастайнай інфармацыяй, ствараць уласны вучэбны прадукт. Акрамя таго, грамадскую занепакоенасць выклікае і той аспект, што сённяшнія дзеці даволі шмат часу праводзяць у віртуальнай прасторы, дзе атрымліваюць велізарны аб'ём рознай інфармацыі, якая неадназначна ўплывае на іх свядомасць.*

*З мэтай вырашэння дадзеных праблем у змесце артыкула ўвага звяртаецца на апісанне аптымальнай мадэлі прымянення табліц розных відаў, накіраваных на развіццё спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроках беларускай мовы ў V–VI класах.*

Сучасны ўрок — гэта мадэль-праекцыя ўзаемадзеяння ”настаўнік — вучні“, дзе апошнім у ідэале павінна адводзіцца не пасіўная роля назіральнікаў, а актыўных удзельнікаў навучальнага працэсу.

Каб абудзіць цікавасць вучняў сярэдняга школьнага ўзросту да вывучэння моўнага матэрыялу на ўроках беларускай мовы, забяспечыць зрокавае ўсвядамленне заканамернасці шматлікіх правілаў па прадмеце, лічым мэтазгодным актыўна выкарыстоўваць табліцы як наглядныя дапаможныя сродкі.

Так, пачынаючы з пятага класа, наглядна дэманструю дзецям (ці яны самі), дзе яны рэальна могуць прысутнічаць у жыцці. Як прыклады – расклад руху транспарту і расклад урокаў у школе, інфармацыя на тэатральных афішах і ў штотыднёвіку ці календары, праграма для работы з электроннымі табліцамі Microsoft Excel, табліца Мендзялеева і многае іншае.

На канкрэтных прыкладах школьнікі бачаць і ўсведамляюць, што табліцы (*ад лац. tabula – дошка, табліца*) даволі шырока выкарыстоўваюцца ў розных сферах жыцця [6, с. 456]. Больш таго, звяртаючыся да іх, можна лёгка і цікава ”пабудаваць“ каркас любога правіла, узнавіць і сістэматызаваць пэўную інфармацыю.

На вучэбных занятках (урокі, факультатыўныя заняткі) розныя віды табліц і іх мадэлі вучні будуюць (дапаўняюць) у рабочых і дапаможных сшытках, з дапамогай камп'ютарнай праграмы PowerPoint ствараюць з імі тэматычныя прэзентацыі. Дзеці працуюць індывідуальна, у парах, у групах, калектыўна.

Станоўчы план табліц, лічым, у іх універсальнасці: з імі вучні працуюць на розных этапах урока, найбольш эфектыўна – на ўроках паўтарэння, абагульнення і сістэматызацыі. Пры гэтым улічваецца іх індывідуальны тэмп работы, развіваецца ўпэўненасць у сваіх здольнасцях.

Сістэму працы можна прадставіць наступным чынам (табліца 1):

| **Мадэль выкарыстання табліц розных відаў на ўроках беларускай мовы ў V–VI класах** | |
|---|---|
| *Этап урока* | *Від табліцы* |
| Мэтавызначэнне | Табліца мэты |
| Вывучэнне новага матэрыялу | Пазнавальная, даведачная |
| Замацаванне ўменняў і навыкаў | Трэніровачная, кантролю, табліца-схема |
| Паўтарэнне вывучанага матэрыялу | Інструктыўная, пазнавальная, кантролю і карэкцыі |
| Абагульненне і сістэматызацыя вывучанага | Трэніровачная, інструктыўная, кантролю і карэкцыі |
| Рэфлексія | Табліца ацэнкі (самаадчування) |

Табліца 1. – Мадэль выкарыстання табліц розных відаў на ўроках беларускай мовы ў V–VI класах

Важным этапам у пачатку ўрока, вядома, з'яўляецца яго *мэтавызначэнне*. Каб вучні, пачынаючы з пятага класа, гэта добра ўсведамлялі, прапаную ім з першых урокаў спачатку сумесна, пазней самастойна запоўняць ***табліцу ”Мэта ўрока“***, сутнасць якой заключаецца ў прагназаванні чаканага выніку ў канцы ўрока (*тэхналогія актыўнай ацэнкі*): ”буду ведаць (умець)“, ”змагу“, ”буду валодаць спосабам“, ”на ШтоБуЗу“ [3, с.61]. (Табліца 2).

| Дата:__________<br>Тэма ўрока:________________________________ | | |
|---|---|---|
| Буду ведаць | Змагу | На што буду звяртаць увагу |
| | | |

Табліца 2.– Форма табліцы ”Мэта ўрока“

Далей у кантэксце ўрока (у залежнасці ад яго тыпу, структуры, формы) выкарыстоўваю іншыя віды табліц: *пазнавальныя, інструктыўныя, трэніровачныя, даведачныя, а таксама рэфлексіўныя, табліцы кантролю і карэкцыі* [5, с. 197].

Так, напрыклад, з дапамогай ***пазнавальных (дэманстрацыйных) табліц*** вучні спачатку назіраюць за моўнай з'явай, а пасля даюць да яе каментар. Далейшая работа часцей носіць калектыўны (групавы) характар і праводзіцца ў вуснай форме. Прывяду наступны прыклад пазнавальнай табліцы (табліца 3):

| **Ведаю!** | | |
|---|---|---|
| Прыстаўкі | | |
| на ***з*** | на ***с*** | на ***б, д*** |
| перад звонкімі зычнымі: **разда**ць, **уз**рушыць. | перад глухімі зычнымі: **бяс**платна, **ус**хваляваць. | незалежна ад вымаўлення: **аб**секчы, **аб**грызці, **пад**тачыць, **пад**біць. |
| **Запомню!** | | |
| Калі прыстаўка заканчваецца на ***з, с, д*** або ***б,*** а корань пачынаецца з іх, то адбываецца падваенне літар: аббегчы, аддаць, рассцілаць, бясспрэчна.<br>**АЛЕ!** Расада, расаднік (месца для вырошчвання расады), расол, ростань. | | |

Табліца 3. – Табліца по тэме ”Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны“ (VI клас)

Пазнавальныя табліцы даволі актуальныя і на этапах засваення новага матэрыялу, падчас паўтарэння пройдзенага (шляхам разгляду некалькіх параграфаў адной тэмы блокам ці пры правядзенні бягучага кантролю). Гэта натуральна: менавіта табліца прадугледжвае пэўную групіроўку матэрыялу, яго сістэматызацыю [4, с. 15].

З шэрагу пазнавальных табліц у сваёй педагагічнай дзейнасці выкарыстоўваю табліцы на развіццё такіх *спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў*, як размеркаванне, падбор, утварэнне, параўнанне, абгрунтаванне, камбінаванне, лагічны аналіз, пераклад моўных з'яў. Напрыклад, пазнавальная табліца на развіццё лагічнага аналізу і ўтварэння.

Тэма **”Суфікс як значымая частка слова“** (VI клас)

**Заданне.** Устаўце ў другі слупок словы, якія ўтварыліся ад папярэдніх слоў з першага слупка.

| Утваральнае слова | Вытворнае слова | Вытворнае слова |
|---|---|---|
| школа | | школьніцкі |
| зуб | | зубочак |
| рыба | | рыбачка |
| век | | вечнасць |

Табліца 4. – Прыклад пазнавальнай табліцы на развіццё камбінавання як спосабу вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў.

Тэма **"Утварэнне, скланенне і правапіс прыналежных прыметнікаў"** (VI клас)

**Заданне.** Устанавіце адпаведнасць паміж словамі левага і правага слупка. Утварыце ад назоўнікаў, што запісаны ў дужках, прыналежныя прыметнікі. Запішыце атрыманыя словазлучэнні. Растлумачце значэнне двух фразеалагізмаў (на выбар).

| | |
|---|---|
| А. (Ахілес) | 1. Мова |
| Б. (Дамокл) | 2. Праца |
| В. (Эзоп) | 3. Пята |
| Г. (Пір) | 4. Меч |
| Д. (Сізіф) | 5. Перамога |

А.________________________________
Б.________________________________
В.________________________________
Г.________________________________
Д.________________________________

Табліца 5. – Пазнавальная табліца на развіццё камбінавання як спосабу вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў

Улічваючы арыентаванне сучаснага працэсу навучання на кампетэнтнасны падыход, работу з пазнавальнымі табліцамі часта прапануецца вучням у адзінстве з тэкстам. Пры арганізацыі такой працы дзеці вызначаюць яго дамінантныя характарыстыкі: стыль, тып, тэму, галоўную думку (ідэю), падбіраюць загаловак. Прапаную тыповую мадэль табліцы для работы з тэкстам [4, с. 15]. (Табліца 6).

| Тэкст | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Стыль | Тып | Тэма | Галоўная думка | Загаловак |
| | | | | |

Табліца 6. – Тыповая мадэль табліцы

Для таго, каб работа з табліцамі мела для вучняў разнастайны, а не шаблонны характар, на ўроках беларускай мовы выкарыстоўваю сучасную мадэль табліц – кластар (ад англ. *гронка, пучок, сузор'е*) у дзвюх яго формах – планету са спадарожнікамі і блок-схему (малюнак):

Вядома, што ў вучэбных дапаможніках для вучняў V–VI класаў [1, 2] прапануюцца гатовыя мадэлі пазнавальных табліц. Аднак гэта "чужы" моўны прадукт. Табліца, пабудаваная ці дапоўненая вучнем самастойна, мае для яго куды большы вучэбны і пазнавальны эфект.

На этапах замацавання ўменняў і навыкаў, паўтарэння (абагульнення), карэкцыі ведаў часта звяртаю падлеткаў да ***інструктыўных (разгорнута прадпісальных) табліц***, якія наглядна ілюструюць (даюць інструктаж), у якой паслядоўнасці трэба выконаць дзеянні на прымяненне пэўнага правіла. Увазе дзяцей прапаную як гатовыя віды табліц, так і калектыўна створаныя. Прыводзячы асацыяцыі да жыццёвых рэалій, вучні параўноўваюць інструктыўныя табліцы з анатацыямі да медпрэпаратаў, з прынцыпам работы аўтанавігатара і інш.




Малюнак. – Прыклад мадэлі табліц-кластараў

Дзякуючы дакладнаму "раскладанню на часткі" пэўнага дзеяння і пакрокаваму апісанню прымянення правіла, вучні асэнсавана выконваюць розныя віды моўных разбораў. Напрыклад, марфалагічны разбор назоўніка (VI клас).

**Заданне**. Выканайце марфалагічны разбор назоўнікаў, якія сустракаюцца ў сказе.

Сцёпка гаварыў так проста і разумна, што яго слухалі з вялікай цікавасцю *(Я. Колас)*.

| Слова ў сказе | Часціна мовы | Пачатковая форма | Агульны/ уласны | Адушаўлёны/ неадушаўлёны | Канкрэтны/ абстрактны | Род | Скланенне | Склон | Лік | Сінтаксічная роля ў сказе |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | |

На этапах замацавання вывучаемага матэрыялу ці яго абагульнення і сістэматызацыі часта звяртаю вучняў да трэніровачных табліц, сутнасць работы з якімі заключаецца ў фарміраванні пэўнага навыку праз шматразовае выкананне вучнямі разнастайных практыкаванняў ці заданняў.

Падчас работы з трэніровачнымі табліцамі развіваю ў вучняў уменні комплексна працаваць з тэкстам, даказваць прыкладамі правіла, класіфікаваць, карэкціраваць моўную з'яву, працаваць з графічнымі, асацыятыўнымі мадэлямі. Прывяду наступны прыклад.

Тэма "**Марфемная будова слова**" (VI клас)

**Заданне.** Выканайце графічны разбор прыведзеных у табліцы слоў.

| Словы | Склад слова | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | ¬ | ⌒ | ^ | ^ | ⌐ | □ |
| лесавік | | + | + | + | | + |
| бесклапотны | + | + | + | | | + |
| які-небудзь | | + | | | + | |
| пяцьдзясят | | + | | | | + |

Карысным лічым на этапах замацавання і абагульнення арыенціраваць вучняў на работу з ***табліцамі-схемамі*** (*апорна-аналітычнымі*), якія дазваляюць больш ёміста асэнсаваць і запомніць моўны матэрыял. (Табліца 7).

Тэма "**Поўная і кароткая форма якасных прыметнікаў**" (VI клас)




| м.р | ж.р. | н.р. |
|---|---|---|
| нулявы канчатак:<br>бацька рад□<br>адз. л. | -а:<br>маці рад**а**<br>адз.л. | -а:<br>дзіця рад**а**<br>адз.л. |
| мн.л | | |
| -ы | -ы | -ы |
| бацькі рады | маці рады | дзеці рады |
| Кароткія прыметнікі **не** скланяюцца. Яны змяняюцца па ліках, а ў адзіночным ліку – і па родах. у сказе кароткія прыметнікі звычайна з'яўляюцца выказнікамі. | | |

Табліца 7. – Прыклад табліцы-схемы

***Табліцы кантролю і карэкцыі*** дапамагаюць мабільна арганізаваць розныя віды кантролю на ўроку (табліцы 8, 9).

Тэма "**Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі**" (V клас)

**Заданне.** Успомніце, якія знакі прыпынку ставяцца ў сказах з аднароднымі членамі. Пакажыце гэта на схемах. Прыдумайце свае сказы.

| Схема | Сказ |
|---|---|
| О і О | |
| О і О і О | |
| О і О і О | |

Табліца 8

Тэма "**Правапіс канчаткаў назоўнікаў 1-ага скл. адз.л.**" (VI клас)

**Заданне.** Закрэсліце няправільны варыянт напісання.

| | |
|---|---|
| сок у шклянцы | сок у шклянке |
| затрымацца на працэ | затрымацца на працы |
| мыцца ў лазне | мыцца ў лазні |
| згубіцца ў завіру | згубіцца ў завірухе |

Табліца 9

З мэтай развіцця ў школьнікаў моўнай і маўленчай кампетэнцый на ўроках беларускай мовы таксама выкарыстоўваю даведачныя (для інфарміравання) табліцы, інакш – "дапамагайкі", якія маюць для вучняў інфармацыйнае значэнне і набываюць гульнявы (спаборніцкі) эфект (табліцы 10, 11).

Улічваючы творчую накіраванасць даведачных табліц, я класіфікую іх па рубрыках: "Паразважаем", "Адпачнём", "Запомні!", "Ці ведаеш ты?". Пачынаючы з пятага класа, табліцы-дапамагайкі вучні запісваюць у творчыя слоўнікі, якія змяшчаюць прыказкі, прымаўкі, цытаты вядомых пісьменнікаў, пераклады моўных адзінак з рускай мовы на беларускую.

Работа з даведачнымі табліцамі, лічым, вельмі патрэбная для падлеткаў, бо пашырае іх агульны кругагляд, змяшчае карысную інфармацыі па розных раздзелах мовы. Гэта, у сваю чаргу, абавязкова дасць станоўчы эфект у працэсе падрыхтоўкі дзяцей да комплекснай алімпіяды па мове і літаратуры, ЦТ, напісанні даследчых (творчых) работ.

Тэма "**Аснова і канчатак. Нулявы канчатак**" (V клас)

**Заданне.** Злучыце стрэлкамі часткі прыказак. Дапішыце ў словах канчаткі.

| | |
|---|---|
| Сямейк... мал... | ды цяжка дыбаць. |
| І сен... цэл.., | а сорам – не дым. |
| Лёгка сказаць, | і коз... сытыя. |
| Гразь – не карост.., | ды работ... хапае. |

Табліца 10

З мэтай развіцця ў падлеткаў навыку канцэнтрацыі ўвагі, умення ацэньваць сваю вучэбную дзейнасць на ўроку, аналізаваць свой унутраны стан, у канцы ўрока часта прапаную ім запоўніць рэфлексіўную табліцу (інакш – табліцу ацэнкі ці самаадчування). Прапаную адзін варыянт такой табліцы:

**Заданне.** Ацаніце сваю работу на ўроку з дапамогай прыказак.

| | |
|---|---|
| З разумнаю галавою і рукам лёгка. | |
| Дзе розумам не дайду, дык у кніжцы знайду. | |
| Меней гавары, болей пачуеш. | |

Табліца 11

Такім чынам, у працэсе сумеснай дзейнасці настаўніка і вучняў на ўроку з выкарыстаннем розных відаў вучэбных табліц вучні з'яўляюцца суб'ектамі навучання, бо самастойна (ці сумесна) здабываюць (дапаўняюць, аналізуюць) пэўную інфармацыю з вучэбных дапаможнікаў ці іншых крыніц. Яны працуюць у парах, групах, камандзе, што з'яўляецца важным фактарам іх сацыялізацыі. Настаўнік жа часцей выступае толькі ў ролі арганізатара, кансультанта ці эксперта.

З дапамогай табліц адбываецца фарміраванне у вучняў розных спосабаў іх вучэбна-пазнавальнай дзейнасці: уменні параўноўваць, класіфікаваць моўны матэрыял, камбінаваць яго; утвараць асацыятыўныя, графічныя мадэлі; працаваць з алгарытмамі; выконваць лагічны аналіз; умець абгрунтоўваць уласную думку і прыводзіць уласныя прыклады; уменне комплексна працаваць з тэкстам. Акрамя таго, табліцы як сродкі сімвалічнай нагляднасці актывізуюць усю разумовую дзейнасць школьнікаў, садзейнічаюць больш паспяховаму працяканню такіх псіхічных працэсаў, як успрыманне, мысленне, запамінанне.

Працуючы з рознымі відамі табліц, вучні становяцца больш дасведчанымі ў інфармацыйным свеце: вучацца аналізаваць, апрацоўваць тую ці іншую інфармацыю, а не прымаць на веру ўсё тое, што знойдзена і прачытана ў розных крыніцах, інтэрнэт-сеціве.

## Спіс літаратуры

1. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з белар. і руск. мовамі навучання: у 2 ч. / Г.М. Валочка [і інш.]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 1. – 142 с.; / Г.М. Валочка [і інш.]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – 143 с.

2. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з белар. і руск. мовамі навучання / Г.М. Валочка [і інш.]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2020. – 239 с.

3. Запрудскі, М.І. Сучасныя школьныя тэхналогіі – 3 / М.І. Запрудскі. – Мінск, 2017. – 168 с.
4. Зельманава, Л.М. Нагляднасць у выкладанні рускай мовы: дапаможнік для настаўніка / Л.М. Зельманава. – Масква: Асвета, 1984. – 159 с.
5. Педагагічная энцыклапедыя: у 6 т. / Ф.М. Пятроў [і інш.]. – Масква: Савецкая Энцыклапедыя, 1968. – Т. 4. Сн – Я. – С. 230 6. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т. 5. Кн. 1. С–У / [Рэд. тома М.Р. Суднік]. – Мінск: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 1982. – С. 456.

*Дата поступления в редакцию: 13.11.2022*

# АРГАНІЗАЦЫЯ ЛЕКСІЧНАЙ РАБОТЫ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў І–ІV КЛАСАХ

*Пачтарова Вольга Васільеўна*

***Анатацыя.*** *У артыкуле прадстаўлены этапы работы па засваенні вучнямі пачатковых класаў беларускай мовы. Прыводзяцца прыклады практычных заданняў для пашырэння лексічнага запасу вучняў па асноўных вывучаемых тэмах.*

Галоўнай мэтай навучання беларускай мове ў І–ІV класах з'яўляецца авалоданне навучэнцамі камунікатыўнымі ўменнямі і навыкамі, неабходнымі для эфектыўнага выкарыстання мовы ў розных сітуацыях зносін, развіццё іх творчага патэнцыялу, далучэнне праз мову да культурных традыцый беларускага народа.

З першага класа вучні вывучаюць беларускую і рускую мовы. Падабенства дзвюх моў садзейнічае разуменню пры авалоданні беларускай мовай, але пры аднаўленні беларускага маўлення, ужыванні беларускай лексікі, якая адрозніваецца па гучанні ад рускай, узнікаюць цяжкасці. Вучань павінен у першую чаргу авалодаць пэўным лексічным запасам. Але для паспяховага авалодання беларускай мовай неабходна арганізаваць сістэмную работу не толькі па засваенні лексікі, але і па ўключэнні яе ў актыўную мову вучняў.

Пры вывучэнні асобных ізаляваных набораў лексікі вучні сутыкаюцца з праблемай ужывання вывучаных слоў у мове, граматычнай сувязі вывучанай лексікі з іншымі словамі. Таму праца ў дадзеным накірунку павінна ўключаць некалькі этапаў, якія заснаваны на дзеяннях са словамі, а не на механічным завучванні.

**Этап 1: знаёмства з новымі словамі.**

Важна ўводзіць новыя словы цэлымі тэматычнымі групамі. Лепш, калі словы будуць звязаны асацыяцыямі, канкрэтнай сітуацыяй ( відэлец-лыжка-ежа-талерка-смачны....), ці наадварот будуць прадстаўляць супрацьлеглыя паняцці (сябар-вораг, добры-дрэнны...). У набор лексікі трэбы ўключыць словы-прадметы, прыкметы, дзеянні (вочы-вялікія,блакітныя-заплюшчыў, міргае), бо слова не існуе ізалявана, яно павінна суадносіцца з іншымі словамі.

**Этап 2: запамінанне новых слоў.**

Важна не задаваць вучням "вывучыць словы". Новая лексіка павінна ўвайсці ў мову вучня з дапамогай спецыяльных практыкаванняў. Найбольш распаўсюджаныя сярод іх: пераклад, падбор сінонімаў і антонімаў, этымалагічны аналіз, разуменне праз кантэкст, падбор падыходзячых па сэнсе слоў, тлумачэнне значэння, выкарыстанне малюнкаў, мімікі і жэстаў.

**Этап 3: уключэнне новай лексікі ў маўленне, сувязь з раней вывучанай лексікай.**

Важна адразу пасля ўвядзення новых слоў адразу пераходзіць да дзеянняў з імі. Гэта павінны быць прадуктыўныя віды маўленчай дзейнасці: пісьмо, гаварэнне, пераклад, выпраўленне маўленчых памылак.

Прыводзім прыклады заданняў па ўвядзенні, запамінанні і ўключэнні беларускай лексікі ў маўленне вучняў. Такія заданні можна выкарыстоўваць у І класе на ўроках беларускай мовы пры вывучэнні тэматычных груп лексікі, а таксама ў далейшым для пашырэння слоўнікавага запасу вучняў, замацавання вывучанай лексікі і ўмення ўжываць яе ў канкрэтных маўленчых сітуацыях.

**Тэма. Я і мая школа. Школьныя памяшканні.**

*Словы для азнаямлення і даведак пры выкананні заданняў.*

| Рэчы | Памяшканні | Дзеянні |
|---|---|---|
| Дошка – доска<br>Шафа – шкаф<br>Крэйда – мел<br>Анучка – тряпка<br>Кветкі – цветы<br>Паліца – полка | Калідор<br>Бібліятэка<br>Спартыўная зала<br>Клас | Наведваць – посещать<br>Вучыцца – учиться<br>Гуляць – играть<br>Займацца – заниматься |

***Заданні.***

1. На малюнку абвядзі крэйду чырвоным, анучкі сінім, кветку зялёным колерам.



2. Падкрэслі словы, напісаныя па-беларуску.
ШАФА ШКАФ ДОШКА ДОСКА